Источник: "Краязнаўчая газета" - 2013-05-23

# На тым тыдні...

✓**8 мая** Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа зладзіў **творчую сустрэчу з Міколам Жыгоцкім**, чалавекам, чыё дзяцінства супала з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны. Ён – аўтар кніг пра Якуба Коласа, пра многія мясціны, пра многіх герояў, у прыватнасці, пра дзеда Талаша (героя аповесці «Дрыгва»). Мікола Рыгоравіч звыш паўстагоддзя працаваў у музеі Якуба Коласа, зрабіў каштоўны ўклад у развіццё коласазнаўства. Гэтым разам ён прэзентаваў кнігу «Якуб Колас і легендарны дзед Талаш», дзе разглядаецца жыццё і дзейнасць класіка і двойчы партызана Васіля Талаша, аналізуецца публіцыстыка і паэзія песняра ваеннага часу. Выкарыстаныя архіўныя дакументы, лісты, дапоўненыя аповедамі людзей, якія сустракаліся і ведалі народнага паэта Якуба Коласа і партызана Васіля Ісаевіча Талаша ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Да 70-годдзя паэмы «Суд у лесе» падрыхтаваная выстаўка з фондаў музея (рукапісы паэмы, кнігі з дароўнымі надпісамі песняра сябрам і знаёмым, розныя выданні паэмы).

✓**З 8 па 19 мая** ў мінскім Палацы мастацтваў працавала выстаўка **«Фарбы пераможнай вясны»**, прымеркаваная да свята Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. На ёй былі прадстаўленыя працы мастакоў-ветэранаў, удзельнікаў вайны, сяброў Беларускага саюза мастакоў, якія самі спазналі пакуты ваеннага ліхалецця.

✓**16 мая** Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры і Нацыянальная бібліятэка Беларусі арганізавалі сумеснае **мерапрыемства «Чараўнік з краіны маленства»**, прысвечанае 130-годдзю з дня нараджэння Янкі Маўра. У яго рамках адбылося адкрыццё літаратурна-дакументальнай выстаўкі «Янка Маўр. Рамантык. Падарожнік. Педагог» з фондаў музея. У экспазіцыі прадстаўленыя рукапісы, машынапісы, асабістыя рэчы пісьменніка, кнігі з дароўнымі надпісамі і інш.

У імпрэзе ўзялі ўдзел пісьменнікі Уладзімір Ліпскі, Леанід Левановіч, даследчыкі творчасці пісьменніка, а таксама родныя і блізкія Янкі Маўра.

✓**17 мая** ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы адбылася **літаратурна-музычная вечарына «Са мной мой век...»**, прымеркаваная да 100-годдзя з дня нараджэння Васіля Уладзіміравіча Івашчыка, выдатнага беларускага даследчыка-літаратуразнаўца, педагога і паэта. Па яго падручніках не адно пакаленне беларускіх школьнікаў вучылася некалькі дзесяцігоддзяў.

✓**16 і 17 мая** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылася **ІІ Міжнародная навуковая канферэнцыя «Берковские чтения. Книжная культура в контексте международных контактов»** у гонар вядомага навукоўца, члена-карэспандэнта Акадэміі навук СССР, гісторыка літаратуры Паўла Беркава (1896–1969), унікальны кніжны збор якога захоўваецца ў фондах бібліятэкі.

Канферэнцыю арганізавалі ЦНБ НАН Беларусі і Цэнтр даследаванняў кніжнай культуры Федэральнай дзяржаўнай бюджэтнай установы навукі «Навуковы і выдавецкі цэнтр "Наука"» Расійскай акадэміі навук. Абмяркоўваліся дзейнасць П. Беркава ў даследаванні гісторыі, тэорыі, метадалогіі кнігазнаўства і бібліяграфіі, сацыяльнай ролі кнігі і сродкаў масавай інфармацыі, літаратуры, моваазнаўства і інш.